■ Ну і ну!

# «АПОСТАЛ» З МАГІЛЁВА СТАРЭЙШЫ ЗА СКАРЫНАЎСКІ «ПСАЛТЫР»?

Дагэтуль ніхто не падвяргаў сумненню, што першая друкаваная кніга на беларускай мове называлася «Псалтыр» і была выдадзена Францішкам Скарынам у 1517 годзе ў Празе. Але нядаўна ўкраінская даследчыца Святлана Кагамлык наведаміла ў сваёй манаграфіі «Кіева-Пячэрская лаўра. Свет праваслаўнай духоўнасці і культуры» сенсацыйныя звесткі. Маўляў, у архівах Кіева-Пячэрскай лаўры захаваўся рэестр, складзены манахамі ў 1736-1744 гадах, дзе пазначана, што ў XVIII стагоддзі пры царкве Пакроў Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Ялуўка знаходзіўся «Апостал», які быў выдадзены ў 1504 годзе ў Магілёве.

Гэтае паведамленне адразу ж выклікала рэзананс. **Дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей БАЦЮКОЎ** звязаўся з даследчыцай і атрымаў інфармацыю, што называецца, з першых рук. Сапраўды, такі гістарычны дакумент існуе, хтосьці нават насупраць яго напісаў здзіўленае «ого!». Святлана Кагамлык лічыць, што зроблена гэта рэмарка не менш за стагоддзе таму. Але трэба яшчэ, каб яе здагадкі пацвердзіла экспертыза.

— Наколькі гэтыя звесткі наогул могуць адпавядаць рэчаіснасці? — пацікавілася «Звязда» ў гісторыка.

— Пакуль гэта адзіны факт на карысць існавання такой кнігі, і зрабіць нейкія высновы, зыходзячы толькі з яго, нельга, — паведаміў ён. — Хутчэй за ўсё гэта нечая памылка. Або размова ідзе пра нейкі рукапісны варыянт. Тым не менш мы збіраемся правесці сваё даследаванне. Сябры-архівісты з Мінска нам у гэтым дапамогуць. Больш дэталёва разбяромся ў гэтай сітуацыі, звярнуўшыся ў той самы прыход, на які робіцца спасылка. Мы ўжо думаем арганізаваць туды экспедыцыю.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# АМАЛЬ 8 ТЫСЯЧ КВАТЭР

## Больш за палову было пабудавана за ўласныя сродкі

**Паводле інфармацыі статыстычнага ўпраўлення Мінска, у першым паўгоддзі ў галоўным мегаполісе краіны было ўведзена ў эксплуатацыю 554,3 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Спецыялісты адзначаюць, што арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці ў студзені—чэрвені тут было пабудавана 7693 кватэры.**

Для гараджан, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 173,7 тысячы квадратных метраў, або 31,3% ад агульнага аб'ёму пабудаванага жылля. З выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі для гэтай катэгорыі грамадзян пабудавана 100,6 тысяч «квадратаў». Эксперты ўпраўлення паведамляюць, што за шэсць месяцаў года на будаўніцтва жылля ў Мінску выкарыстана 4 трлн 275 млрд рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што складае 25% да агульнага аб'ёму інвестыцый. Пераважнай крыніцай фінансавання жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы з'яўляюцца ўласныя сродкі насельніцтва (51,2% гэтых інвестыцый).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# У ЧАКАННІ ПРАЗМЕРНАЙ СПЯКОТЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Аднак, як адзначыў карэспандэнту «Звязды» **намеснік начальніка Белгідрамета Анатоль ПАЛІШЧУК,** такой працяглай цеплыні нашу краіну здзівіць можна толькі часткова. Так, у першым паўгоддзі сярэдняя тэмпература ў Беларусі склала плюс 6,5 градуса, што на 3 градусы вышэй за норму (норма першых шасці месяцаў года — 3,5 градуса).

Але сустракаліся ў пасляваенны час у нас і больш цёплыя перыяды. Напрыклад, сярэдняя тэмпература паветра ў першым паўгоддзі 1989 года была 7,4 градуса, у 1990-м — 7, а ў 2002-м — 6,9 цяпла. Так што, нічога дзіўнага, прыкладна раз на 20 гадоў надвор'е нас песціць працяглым цяплом. І не трэба драматызаваць сітуацыю, лічыць Анатоль Палішчук, бо «было б значна горш, калі б тэмпературны фон у нас стаў на 3 градусы ніжэйшы за кліматычную норму».

### СУХІ ЧЭРВЕНЬ

У аддзеле клімату Белгідрамета нам паведамілі, што з ападкамі ў першай палове года не ўсё так адназначна, як з тэмпературай. За першыя шэсць месяцаў наша тэрыторыя атрымала 233 мм ападкаў пры норме 289 мм. На першы погляд здаецца, што недабор ад нормы ў 20% не такі і крытычны, але... Суперанамальным стаў чэрвень, калі за месяц у краіне выпала толькі 26 мм ападкаў, што складае ўжо 33% ад нормы па месяцы. Сіноптыкі падлічылі, што так мала дажджоў у чэрвені яны фіксуюць упершыню за апошнія 70 гадоў.

### ХОЛАД У МАІ І ГЛЕБАВАЯ ЗАСУХА НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Нягледзячы на тое, што тэмпературны фон па першым паўгоддзі і быў вышэйшым за кліматычную норму, але гэтай вясной назіраўся неаднастайны тэмпературны рэжым, паведамілі нам у аддзеле аграметэапрагназу Белгідраметцэнтра.

Менавіта ў красавіку і маі спецыялісты адзначалі даволі працяглыя перыяды халоднага надвор'я, што адбілася на тэрмінах пачатку пасяўных работ цеплалюбівых культур. У прыватнасці, пазней сёлета пачалі сеяць кукурузу, цукровыя буракі і бульбу. Недабор цяпла і вільгаці ў сярэдзіне вясны адмоўна паўплываў на фарміраванне ўраджаю траў першага ўкосу.

**За чэрвень выпала 26 мм ападкаў, што складае 33% ад нормы. Так мала дажджоў у чэрвені сіноптыкі фіксуюць упершыню за апошнія 70 гадоў.**

А ў чэрвені і першай палове ліпеня аграрыі амаль паўсюдна сутыкнуліся з сур'ёзнай глебавай засухай. Тады яна, галоўным чынам, назіралася на паўднёвым усходзе краіны. Так, у Гомельскай вобласці глебавая засуха з трэцяй дэкады мая гаспадарыла практычна на працягу двух месяцаў. А працяглая адсутнасць глебавай вільгаці ўжо цяпер адмоўна паўплывала на ўраджаі збожжавых і зернебабовых. Пацярпеў і лён, які звычайна інтэнсіўна расце менавіта ў чэрвені-ліпені.



### ПАСЛЯ ДАЖДЖОЎ — І СОНЦА СЯБАР

За мінулы тыдзень на тэрыторыі краіны як след пасвавольнічалі добрыя дажджы. Таму сітуацыя з вільгаццю глебы ў нас значна палепшылася. Эксперты Белгідраметцэнтра сёння ўпэўнены, што далейшае павелічэнне сярэднясутачных тэмператур толькі палепшыць умовы фарміравання ўраджаю цеплалюбівых культур. У першую чаргу сапраўднае цяпло цяпер патрэбна кукурузе, агуркам і таматам. А калі падсумаваць нашу размову з сіноптыкамі, то Анатоль Палішчук і сапраўды мае рацыю — добрае цяпло нам цяпер не перашкодзіць.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Слова выратавальнае

## Не скакаць з моста самагубцу ўгаварыў епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан

Раніцай серады на ферму пешаходнага моста цераз Сож у цэнтральным парку Гомеля забралася маладая дзяўчына, якая, па словах сведкаў, збіралася закончыць жыццё самагубствам. Дарэчы, вышыня яго над ракой складае прыкладна 30 метраў, а падыходы заваraны кратамі — каб пазбегнуць такіх сітуацый. І ўсё ж гэта не стала перашкодай для дзяўчыны, быццам бы, пакрыўджанай на сваю маці. Яе прыезду патэнцыяльная самагубца патрабавала і расказала гэта выратавальнікам, міліцыі і медыкам, якія спрабавалі адгаварыць грамадзянку ад кроку ў бездань.

Побач з мостам знаходзіцца епархіяльнае ўпраўленне, адкуль выйшаў епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан. Ён падышоў да дзяўчыны і пераконваў яе спусціцца. Што канкрэтна казаў святар, не чуў ніхто, а ад каментарыяў уладыка адмовіўся. Але ж вынікам гутаркі стала тое, што праз некалькі хвілін дзяўчына самастойна злезла з фермы моста. **Прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Ксенія ШЫНГІРЭЙ** паведаміла, што 20-гадовая жыхарка Гомельскага раёна часова нідзе не працуе. Цяпер праверкай надзвычайнага здарэння займаецца міліцыя.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

■ Сацыяльны ракурс

# СЯМ'Я, ДЗЕЦІ І ЛЮБОЎ

## Гэта — аснова сэнсу жыцця для большасці мінчан

**Такую выснову можна зрабіць на падставе вынікаў сацыялагічнага апытання, якое было праведзена ў сталіцы сярод жыхароў Мінска ва ўзроставым інтэрвале ад 15 да 44 гадоў Мінскім навукова-даследчым інстытутам сацыяльна-эканамічных праблем.**

Сярод іншых прыярытэтаў таксама самарэалізацыя, адукацыя, здароўе, дапамога людзям, душэўны спакой, камфорт, вера. Цікава, што на пытанне: «Дзеля чаго вы жывяце?» толькі 19,3% апытаных адзначылі ў якасці аднаго з прыярытэтаў матэрыяльна забяспечанае жыццё; кар'еру і высокае становішча ў грамадстве — толькі 11,4%; багацце — 5,8%.

Адказваючы на пытанне: «Якія адносіны складваюцца ў вас у сям'і з мужам (жонкай)?» 62,3% мінчан адказалі, што ў іх дружная, згуртаваная сям'я («нам добра разам»), і 27,2% рэспандэнтаў адзначылі, што ў іх не заўсёды ўсё добра, але яны прывязаныя адно да аднаго. У 5,3% сем'яў кожны жыве сам па сабе.

Паводле атрыманых звестак, значную пагрозу для існавання сям'і ўяўляюць дэфармацыі яе маральна-псіхалагічнага клімату. На думку апытаных жыхароў сталіцы, істотнымі разбуральнымі фактарамі — тымі, што блакіруюць развіццё нараджальнасці, — выступаюць такія сацыяльна-псіхалагічныя з'явы, як хатні гвалт, п'янства і шлюбная нявернасць.

Падчас сацыялагічнага апытання мінчан рэпрадуктыўнага ўзросту былі зададзены тры падобныя пытанні для выяўлення ідэальнай, чаканай і запланаванай колькасці дзяцей. Першым пытаннем было: «Колькі дзяцей, на ваш погляд, павінна быць у ідэальнай сям'і?» Большасць рэспандэнтаў адзначылі наяўнасць дваіх дзяцей у ідэале, жаданнях і планах. Такім чынам, найбольш распаўсюджанай мадэллю сям'і для мінчан з'яўляецца двухдзетная сям'я.

У ідэальнай сям'і, на думку 84,7% апытаных, павінна быць абавязкова больш за адно дзіця. Пры гэтым кожны чацвёрты мяркуе, што ў ідэальнай сям'і павінна быць больш за трое дзяцей. Больш за 2/3 рэспандэнтаў (79,8%) у якасці жаданай для сябе назвалі сям'ю з дваімі і больш дзецьмі, а 74,5% плануюць мець дваіх і больш.

Пры правядзенні сацыялагічнага апытання была выкарыстана камбінаваная імаверная выбарка: шматступенная тэрытарыяльная выбарка з прымяненнем метаду стратыфікацыі адбору. Аб'ём выбаркі склаў 800 чалавек. Памылка выбаркі — да 3%.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ**

■ Гучная справа

# СУРОВЫ ПРЫСУД ХУЛІГАНАМ

**Днямі суд Маскоўскага раёна сталіцы вынес прыгавор у дачыненні да футбольных фанатаў па справе збіцця двух мінчан. У жніўні мінулага года ў раёне станцыі метро «Грушаўка» група маладых людзей ва ўзросце 24—26 гадоў пры дапамозе тэлескапічных дубінак нанесла пацярпелым цяжкія і менш цяжкія цялесныя пашкоджанні.**

Як высветлілася падчас расследавання, хлопцаў збівалі ўдзельнікі нефармальнай каляфутбольнай групоўкі «Нававілка», якая ўваходзіць у фанацкі рух мінскага «Дынама» і прытрымліваецца пазіцый неацызму. Як паведамляе МУС Беларусі, крымінальная справа скончылася вынясеннем прысуду па артыкулах Крымінальнага кодэкса «Хуліганства» і «Наўмыснае нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў»: лідар групоўкі асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі, тры актыўныя ўдзельнікі — на 9 гадоў, 3 гады — яшчэ аднаму з удзельнікаў. Асуджаныя маюць права абскардзіць рашэнне на працягу 10 дзён да ўступлення прысуду ў законную сілу.

Увогуле, прыязнасць да неацызму характэрна для многіх каляфутбольных фанацкіх рухаў. Нядаўна ў суседняй Расіі балельшчыца ФК ЦСКА Вольга Кузькова была пазбаўлена прызa «Міс Абаянне Расійскай футбольнай прэм'ер-лігі» за фотаздымкі з рукой, ускінутай у нацысцкім салюце, якія дзяўчына размяшчала на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*